У СВЕЦЕ КАЗАК

# ЦЯРЭШКА



ЧЫТАЕМ З МАТУЛЯЙ

Жылі-былі стары са старой. Доўга разам жылі, ды дзетак не нажылі. Сядзяць і плачуць. Тут баба і кажа дзеду:

— Давай возьмем калодачку, пакладзем у люлечку — і будзе нам дзіцятка.

На тым і вырашылі. І стаў у іх замест калодачкі сапраўдны сынок расці — Цярэшка. Рос ён, дужэў, з кожным годам розуму набіраўся.



Зрабіў яму стары лодачку, і панадзіўся іх сынок ездзіць рыбу лавіць. А маці яму малачко насіла. Прыйдзе яна на беражок і кліча:

— Цярэшка, сынок, я табе малачка прынесла, плыві хутчэй да беражка!

Пачуе ён яе голас, падплыве да берага, нап’ецца малачка, рыбу маці аддасць і назад плыве.

Аднойчы мама кажа Цярэшку:

— Сынок, будзь асцярожны, цябе пільнуе злая Баба-яга.





І вось неяк паплыў хлопчык ізноў рыбку лавіць. А Баба-яга падышла да берага і крычыць страшным голасам:

— Цярэшка, сынок, я табе малачка прынесла, плыві хутчэй да беражка!



А Цярэшка ведае мамін голас, адразу зразумеў, што гэта не яна кліча, і кажа:

— Плыві далей, мой човен, то не мамін галасок, а Бабы-ягі.

Пачула гэта Баба-яга, пабегла ў сваю хатку, знайшла патрэбную замову і зрабіла сабе такі ж галасок, як у Цярэшкавай мамы. Прыйшла на беражок ды кліча яго. Абазнаўся Цярэшка, падплыў да берага, а Баба-яга яго хоп! — і панесла.



Прыбегла яна ў хатку на курыных ножках, аддала Цярэшку сваёй дачцэ, каб тая ў печы хлапчука падсмажыла, а сама зноў сышла. Але Цярэшка хоць малы, ды ўдалы — не даўся той дзеўцы і замест сябе яе ў печы падсмажыў. А сам выйшаў на двор і забраўся на высокі дуб.



Вярнулася Баба-яга, наелася да адвалу, выбегла з хаты і давай па траве качацца ды прыгаворваць:

— Ох, як мне добра, Цярэшку з’еўшы!

А ён ёй з дуба крычыць:

— Пакачайся, Баба-яга, сваю дачушку з’еўшы!

Убачыла яна Цярэшку на дубе высокім, раззлавалася не на жарт, пабегла да каваля і кажа:



— Каваль, скуй мне сякерку, трэба мне ў ляску адно дрэва ссекчы.

Скаваў каваль ёй сякерку, але ж ведаў, што Бабе-язе не на добрую справу яна патрэбная, і кажа:

— Толькі ты лепей не лязом сячы, а абухом.

Паслухалася каваля Баба-яга: секла дрэва, секла, ды толку мала. Прыпала яна зубамі да дуба і давай грызці ствол.



Бачыць Цярэшка: кепскія яго справы. Тут ляцяць гусі-лебедзі. Стаў хлапчук іх прасіць:

— Гусі-лебедзі, мілыя, вазьміце мяне з сабой.

— Га-га! — адказваюць гусі. — За намі ляціць беднае зашчыпанае гусяня, яно цябе і падбярэ.

Падляцела гусяня, скочыў на яго Цярэшка — і схаваліся яны дзесьці ў аблоках. А калі спусціліся на зямлю, Цярэшка адкарміў зашчыпанае гусяня, і стала яно з тых часоў хутчэй за ўсіх лётаць, а хлапчука добрым словам успамінаць.





**Серыя «У свеце казак»**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

# ЦЯРЭШКА

*ДЛЯ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ*

Дызайн *І. В. Рэзько*

Адказны за выпуск *І. В. Рэзько*

Падпісана да друку 07.04.2014. Фармат 70×90[1]/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Умоўн. друк. арк. 0,59. Тыраж 1500 экз. Заказ 962.

ТАА «Харвест».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

ISBN 978-985-18-2924-4

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск,
Рэспубліка Беларусь.

**ISBN 978-985-18-2924-4**

© Падрыхтоўка, афармленне.
ТАА «Харвест», 2014